**С. А. Талмачова**

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск*

# СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПАВЯТОВЫХ ПА ЧЫНШАВЫХ СПРАВАХ ПРЫСУТНАСЦЕЙ У БЕЛАРУСІ (1886–1914 гг.)

Рэформа чыншавых сялян у Беларусі праводзілася на падставе закона ад 9 чэрвеня 1886 г. [13].

Чыншавікі – гэта частка сельскага насельніцтва заходніх губерняў, якія карысталіся панскай зямлёй на ўмовах бестэрмінова-спадчыннай арэнды з фіксаванай грашовай арэнднай платай (чынш). Апрача чыншу, некаторыя з іх павінны былі адпрацоўваць за зямлю ў панскай гаспадарцы, здаваць памешчыку пэўную колькасць сельскагаспадарчых прадуктаў (збожжа, лён, пянька і г. д.). Гэтая група з'явілася яшчэ ў часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Чыншавае сялянства фарміравалася за кошт выхадцаў з іншых сельскіх саслоўных груп (вольных людзей, памешчыцкіх і дзяржаўных сялян, дробнай шляхты і інш.) [1, с. 111].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аграрная рэформа 1861 г. не ліквідавала чыншавыя адносіны, пра якія ў Палажэннях 19 лютага няма нават упамінанняў. У расійскім заканадаўстве адсутнічала паняцце «чыншавае права», таму многія памешчыкі пасля скасавання дзеяння Статута ВКЛ у Расійскай імперыі ўжо з 40-х гадоў XIX ст. пачалі зганяць чыншавікоў з зямлі, ці пераводзіць іх на становішча часовых арандатараў, ці павышаць памер чыншу. Чыншавікі бароліся за свае правы. Так, у маёнтках Радзівілаў яны карысталіся зямлёй на правах пажыццёвай арэнды яшчэ з XVI ст. Пасля 1865 г. узнік канфлікт: Радзівілы паднялі арэндную плату і запатрабавалі заключэння кантрактаў. У той жа час чыншавікі шэрага засценкаў адмовіліся плаціць чынш, бо прэтэндавалі на набыццё ва ўласнасць зямель за даўнасцю карыстання (да 300 гадоў). Былі распачаты сотні судовых спраў з чыншавікамі [2, с. 47–48], некаторыя даходзілі і да Сената. Так, у 1877 г. Грамадзянскі Касацыйны дэпартамент Сената рабіў тлумачэнні аб незаконнасці і несапраўднасці вечна-чыншавых здзелак, якія былі заключаны пасля адмены ў заходніх губернях Статута ВКЛ [3, с. 25–26].

Абвастрэнне адносін паміж вотчыннікамі і чыншавікамі набыло масавы характар і ў 1876 г. звярнула на сябе ўвагу ўрада. 14 студзеня 1877 г. Камітэт Міністраў прапанаваў міністру ўнутраных спраў А. Цімашаву падрыхтаваць праект вырашэння чыншавага пытання. А. Цімашаў запатрабаваў ад Віленскага і Кіеўскага генерал-губернатараў і Віцебскага, Магілёўскага і Мінскага губернатараў падрабязныя звесткі па названым пытанні, адзначыўшы неабходнасць «соблюдать в деле возможную осторожность и избегать огласки» [4, с. 1]. Адначасова пры МУС была створана чыншавая камісія з прадстаўнікоў міністэрстваў і буйнейшых землеўладальнікаў краю для падрыхтоўкі законапраекта.

Кіеўскі генерал-губернатар А. Дрэнтэльн адзначаў, што «попытки помещиков увеличить чиншевую плату влекли за собою... нередко совершенное прекращение чиншевиками платежей за пользование земельными участками». Пры гэтым, па меркаванні Мінскага губернатара А. Пятрова, «словесное заключение сделок с землевладельцами о вечно-чиншевом владении и трудность, при таком положении формальной стороны догово-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ров, с точностью установить действительную величину чиншевых участков давали чиншевикам возможность безнаказанно увеличивать размеры состоящих в их владении угодий, посредством захватов смежной помещичьей земли. В то же время исполнение решений судебных мест о выселении чиншевиков по искам вотчинников встречало иногда столь решительное противодействие первых, что для осуществления своего требовало вмешательства военной силы» [14, арк. 286 адв.–287].

Вызначэнне прыналежнасці асобы да катэгорыі сельскіх вечных чыншавікоў было складаным. Так, Мінскі губернатар А. Пятроў адзначаў, што ў сакавіку 1883 г. у губерні налічваліся 4564 двары і 23 048 душ чыншавікоў, правы якіх не падлягалі сумненню і не адмаўляліся вотчыннікамі. Але даныя не былі дакладнымі, бо збіраліся паліцыяй «негласно и без всяких расследований и рассмотрения документов» [5, с. 1]. На тэрыторыі губерні пражывала шмат асоб, якія вялі судовыя працэсы з памешчыкамі адносна прызнання чыншавых правоў. Так, у Ігуменскім павеце было больш за 70 двароў чыншавікоў у маёнтку князя Вітгенштэйна, але ў прыведзеных губернатарам звестках яны не ўлічаны [5, с. 1]. Такім чынам, яшчэ ў час распрацоўкі праектаў чыншавай рэформы ўлады сутыкнуліся з праблемай вызначэння статусу асоб, якія маглі прэтэндаваць на пазямельнае ўладкаванне на новых умовах. Віленскі генерал-губернатар адзначаў, што ў Паўночна-Заходнім краі колькасць чыншавікоў, правы якіх пацвярджаліся пісьмовымі дакументамі, была невялікай [14, арк. 286 адв.].

У адпаведнасці з законам ад 9 чэрвеня 1886 г. у 9 заходніх губернях скасоўваліся чыншавыя пазямельныя адносіны, а чыншавікоў пераводзілі на абавязковы выкуп. Яны павінны былі даказаць права спадчыннай арэнды, падаўшы шэраг дакументаў у спецыяльна створаныя павятовыя па чыншавых справах прысутнасці. Чыншавікі, якія даказалі свае арэндныя правы на зямельныя ўчасткі, маглі на працягу 3 гадоў выкупіць іх ці замяніць чыншавае трыманне простай арэндай па дабрачынным пагадненні з землеўладальнікам. Асоб, якія не мелі дакументаў ці сведак для доказу, пазбаўлялі чыншавых правоў, а таксама тых, хто карыстаўся зямлёй толькі на працягу апошніх 10 гадоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

да рэформы 1886 г. Яны маглі карыстацца зямельным участкам 5 год на ранейшых умовах, а пасля павінны былі пакінуць яго ці заключыць арэндны дагавор на звычайных умовах [1, с. 112].

Для рэалізацыі закона ад 9 чэрвеня 1886 г. ствараліся павятовыя па чыншавых справах прысутнасці. Іх дзейнасць кантралявалася губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі, генерал-губернатарам, а дзе яго не было – міністрам унутраных спраў. Колькасць чыншавых прысутнасцей у павеце вырашалася адпаведнай губернскай прысутнасцю і зацвярджалася генерал-губернатарам ці міністрам унутраных спраў. У Віленскай і Гродзенскай губернях, дзе захаваўся інстытут міравых пасрэднікаў, павятовыя па чыншавых справах прысутнасці ўзначальваліся старшынамі павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў. У Віленскай і Гродзенскай губернях ствралася па 3 павятовых прысутнасцей [15, арк. 18–18 адв.]. Стварэнне аб'яднаных павятовых па чыншавых справах прысутнасцей тут было звязана з існаваннем аб'яднаных з'ездаў міравых пасрэднікаў. У склад прысутнасцей уваходзілі таксама чыноўнік па вызначэнні міністра юстыцыі, адзін з мясцовых землеўладальнікаў па запрашэнні губернатара, а таксама міравы пасрэднік. У Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях з 1878 г. дзейнічалі павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці, таму тут чыншавыя прысутнасці складаліся са старшыны і членаў павятовай па сялянскіх справах прысутнасці, чыноўніка па прызначэнні міністра юстыцыі і аднаго землеўладальніка па запрашэнні губернатара (арт. 28–31) [13, с. 279–280]. У 1886 г. у Мінскай губерні былі створаны чыншавыя прысутнасці ў кожным павеце, а ў Магілёўскай і Віцебскай – па 3, для некалькіх паветаў кожная. Такое размеркаванне было звязана з колькасцю чыншавікоў [15, арк. 6–6 адв., 19, 87]. Скаргі на рашэнні павятовых чыншавых прысутнасцей на працягу двух месяцаў падаваліся ў губернскую прысутнасць, а на апошнюю – у Другі дэпартамент Сената [13, с. 280].

Спрэчкі паміж чыншавікамі і землеўладальнікамі аб прызнанні чыншавых правоў пачаліся практычна адразу. Напрыклад, у 1888 г. Віцебская губернская па сялянскіх справах прысутнасць разгледзела 108 скаргаў на адмову павятовых прысутнасцей пры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

знаць асоб сельскімі вечнымі чыншавікамі, а павятовыя чыншавыя прысутнасці разгледзелі 265 такіх спраў [8, с. 85–86].

У Гродзенскай губерні да 1 студзеня 1902 г. у павятовых па чыншавых справах прысутнасцях разглядаліся справы 4316 чал., з іх атрымалі дазвол на выкуп надзела 931 чал., а 1766 асобам было адмоўлена [9, с. 117]. Да 1 студзеня 1914 г. у губерні падалі хадайніцтвы аб прызнанні чыншавых правоў 4701 чал. [10, с. 106].

Павятовыя па чыншавых справах прысутнасці Віленскай губерні да 1 студзеня 1912 г. дазволілі выкуп зямлі 191 чыншавіку і адмовілі 1798 асобам [7, с. 92]. У Магілёўскай губерні колькасць такіх спраў была адносна невялікай: у 1891 г. павятовымі ўстановамі разглядалася 37 заяў [12, с. 71].

Большая колькасць такога роду спраў была ў Мінскай губерні. Тут да 1 студзеня 1890 г. у паветах ад землеўладальнікаў атрымалі імянныя спісы на 1940 чыншавікоў і хадайніцтвы ад 12 552 асоб, якія самі лічылі сябе чыншавікамі. Пасля праверкі дакументаў неадменнымі членамі павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей, у адпаведнасці з арт. 40–41 Палажэння ад 9 чэрвеня 1886 г., павятовыя па чыншавых справах прысутнасці да 1 студзеня 1890 г. разгледзелі хадайніцтвы 5993 асоб. З гэтай колькасці 450 гаспадароў двароў былі прызнаны чыншавікамі, а 5543 было адмоўлена. Неразгледжанымі засталіся справы яшчэ 8499 асоб. Неадменнымі членамі павятовых па сялянскіх спраў прысутнасцей былі складзены 2894 пратаколы аб мясцовай праверцы чыншавых правоў, чыншавымі прысутнасцямі зацверджаны 2122 пастановы па разгледжаных справах. На губернскім узроўні чыншавікамі былі аспрэчаны 853 пастановы, з іх адхілены 645 скаргаў [11, с. 43–44].

Па падліках В. П. Панюціча, на 1898 г. па 5 заходніх губернях павятовыя чыншавыя прысутнасці разгледзелі дамаганні на ранейшыя чыншавыя землі 21 238 чыншавікоў. Чыншавыя правы на зямлю былі прызнаны толькі ў 3479 (16,4 %) выпадках [1, с. 113].

У 1907 г. Земскі аддзел МУС запатрабаваў ад губернатараў Заходняга краю звесткі аб землеўладкаванні сельскіх вечных чыншавікоў. Да 1 студзеня 1908 г. у павятовых па чыншавых

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

справах прысутнасцях Гродзенскай губерні заставалася 220, Мінскай – 135, Віленскай – 17, Віцебскай – 8 і Магілёўскай – 7 нявырашаных чыншавых спраў. У Віленскай губернскай прысутнасці ў гэты час знаходзіліся на разглядзе 16 хадайніцтваў чыншавікоў, у Мінскай – 9, Гродзенскай і Віцебскай – па 3, а ў Магілёўскай – ні аднаго [6, с. 1–2].

Такім чынам, дзейнасць павятовых па чыншавых справах прысутнасцей была накіравана на тое, каб зменшыць колькасць асоб, якія прэтэндавалі на магчымасць выкупіць зямлю ў памешчыка з урадавай фінансавай дапамогай. Пры гэтым аб'ём работы названых устаноў быў вельмі вялікі, асабліва ў першыя гады пасля абвяшчэння закона. Такі доўгі тэрмін рэалізацыі чыншавай рэформы быў абумоўлены шматразовым пераглядам рашэнняў устаноў рознага ўзроўню. У пачатку XX ст. пераважалі справы, якія былі абскарджаны раней і чакалі новага вырашэння.

## Літаратура


1. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён: у 3 т. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – Т. 2 / пад рэд. В. П. Панюціча. – 552 с.

2. Кахновіч, В. Нясвіжская ардынацыя Радзівілаў падчас апекі над ёй Эдварда Вайніловіча (1904–1914 гг.) / В. Кахновіч // Беларусь, Нясвіжскі край і Эдвард Вайніловіч: матэрыялы навук.-практ. канф., г. Нясвіж, 26 жн. 2016 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Медысонт, 2016. – С. 40–57.

3. Государственный Совет. Заседания 29 и 31 марта, 3, 6, 19, 26 и 28 апреля и 2 мая 1886 г.// Навукова-даведачная бібліятэка Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (далей – НДБ РДГА). Друкаваная запіска (ДЗ) 953.

4. НДБ РДГА. – ДЗ 953. Адз. зах. № 7.

5. Ведомость о числе дворов и душ чиншевиков Минской губернии // НДБ РДГА. – ДЗ 953.

6. Положение землеустройства сельских вечных чиншевиков в Западном крае // НДБ РДГА. – ДЗ 953.

7. Обзор Виленской губернии за 1912 год. – Вильна: Губерн. тип., 1913. – [4], 102, [77] с.

8. Обзор Витебской губернии за 1888 г. – Витебск: Витеб. губерн. тип., 1889. – 98 с., [25] с. табл.

9. Обзор Гродненской губернии за 1901 год. – Гродна: Губерн. тип., 1902. – 4, 120, [101] с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Обзор Гродненской губернии за 1913 год. – Гродна: Губерн. тип., 1914. – 4, 115, [145] с.

11. Обзор Минской губернии за 1899 год. – Минск: Губерн. тип., 1900. – [2], 34, [48] с.

12. Отчет о состоянии Могилёвской губернии за 1891 год. – Могилёв: Тип. Губерн. правления, 1892. – 72 с., 38 табл.

13. Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 3. – Т. 6 (1886), № 3789. – С. 275–283.

14. РДГА. – Ф. 1291. Воп. 33, 1876 г. Спр. 2. Ч. V.

15. РДГА. – Ф. 1291. Воп. 33, 1886 г. Спр. 20.